Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową niezozono ryczałtem.

ВОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 Вільня, Чацьвер 22-га сакавіка 1928 г. Год 1

Што рабіць нашым паслом.

Ужо другі раз праз увесь час жыцьця пад Польшчай беларусы з зацікаўленасьцяй чакалі рэзультатаў выбараў у Сойм і Сэнат: першы раз у 1922 годзе, другі раз нядаўна, на нашых вачох. 1922 год прынес шмат нясподзяванак, што да выбараў, 11 беларускіх паслоў, выбраных тады, лічылі за вялікую перамогу. Што-ж дала праца гэтых 11 паслоў для беларускага працоўнага народу пад Польшчай? І шмат, і нічога. Нічога не дала ў самым Сойме, бо ўсе польскія групіроўкі да мінімальных і здавалася-б зусім зразумелых беларускіх дамаганьняў, як родная ўрадовая школа, скасаваньне асадніцтва, правядзеньне належнай зямельнай рэформы ў нашым краі і г. д., аднасіліся варожа, так што беларусам прышлося быць у апазіцыі да ўсіх існаваўшых у працягу першага Сойму ўрадаў. Але з апазіцыяй гэтай Сойм зусім ня лічыўся, ніводная дамаганьне, ніводная прапазіцыя, што да палепшаньня нашага жыцьця, не прайшла праз Сойм, а ўсе ўрады рабілі сваё, зусім ня лічачыся з тым, чаго дамагаліся беларускае соймавае прадстаўніцтва. Дык праца на соймавым грунце нічога для нас не дала.

Затое дала шмат праца па за Соймам. Папярэднія нашы прадстаўнікі ў Сойме зразумелі, відаць, добра, што ў самым Сойме, апрача выкарыстаньня яго, як трыбуны для голасу аб Беларускім народзе пад Польшчай і аб яго патрэбах, нічога зрабіць ня ўдасца і таму вельмі хутка кінулі думку аб карысная працы ў Сойме. Усе сілы тады кінулі яны на вёску і наагул на нашы землі і палалі арганізоўваць яе ў сэньсе нацыянальным, культурным і палітычным. Праца ў гэтым кірунку дала вельмі вялікія рэзультаты. Гаварыць аб гэтых рэзультатах шмат ня трэба, трэба прыгледзіцца толькі да тэй нацыянальнай і сацыяльнай сьвядомасьці, якая ўстае у беларускай працоўнай гушчы. *Вось гэта сьвядомасьць і зьяўляецца запраўдным здабыткам нашых прадстаўнікоў у папярэднім Сойме.*

Дзякуючы, палітычнае арганізаванасьці, якую праводзілі нашы прадстаўнікі ў беларускіх працоўных масах, сягоньня няма, але яна была, а што яе сягоньня няма—дык гэта ня іх віна, бо і самі яны папалі ў вельмі „няпрыемныя“ варункі. Ясна, што тут ідзе гутарка не аб усіх быўшых паслох. Што далі беларускай справе такія Аўсянікі, Ярэмічы, Рагулі? Апрача бяздзейнасьці, шкоднай дзейнасьці і дзейнасьці на сваю асабістую карысьць—нічога. Іх крамка пад фірмай „Сялянскі Саюз“ і сягоньня істнуе, але якая карысьць справе ад яе, хіба кожнаму ведама. Дык можа таму толькі яна істнуе, што зьяўляецца шкоднай беларускаму народу.

Нядаўныя выбары далі вельмі шчуплыя рэзультаты ў параўнаньні з нашымі магчымасьцямі: толькі чатырох сялянска-работніцкіх паслоў і ніводнага сэнатара. Чаму такія вынікі? Распаўсюджвацца тут мы ня будзем, небясьпечна бы і зразумела кожнаму, хто быў сьведкам выбараў. Апрача чатырох сялянска-работніцкіх паслоў, прайшлі яшчэ чатыры ад сельсаюзу і хадацы ды два Станкевічаўцы, але добрага нічога ад іх ня можна спадзявацца, па колькі чатыры першыя зьяўляюцца наступнікамі Ярэміча і Рагулі, а другія два паходзяць яшчэ з цямнейшых крыніц. Дык ясна, што на карысную працу іх разьлічваць ня можна.

Што-ж застаецца рабіць гэтым чатыром сялянска-работніцкім паслом? Ясна, што на соймавым грунце, апрача выкарыстаньня Сойму, як трыбуны дзеля выказваньня ўсіх нашых патрэб і крыўд, зрабіць ім нічога ня ўдасца, не гаворачы ўжо аб тым, што іх толькі чатырох. За тое шмат зрабіць яны могуць па-за Соймам. Яны трапляюць у лепшыя варункі, як калішнія іх папярэднікі, бо як нацыянальная так і сацыяльная сьвядомасьць беларускае працоўнае гушчы ўзрасла за апошнія пяць гадоў у некальні разоў. Узрасла так сама і сьвядомасьць патрэбы роднае, беларускае культуры, роднае, беларускае школы. Значна ўзрасла сьвядомасьць патрэбы арганізацыі як культурнай так і палітычнай і цяга да гэтай арганізацыі чуецца на кожным кроку. Што-ж можа быць лепшай падставай для грамадзкае і культурнае працы, як сьвядомасьць народнае гушчы?

Дык гэту сьвядомасьць мусяць выкарыстаць нашы выбраныя і, апіраючыся на яе, мусяць імкнуцца да таго, каб правясьці моцную арганізацыю беларускае працоўнае гушчы, як у палітычным так і ў культурным напрамку, бо толькі добрая арганізацыя можа быць падставай да палепшаньня нашага жыцьця сучаснага і будучага.

Дык за работу ў добры час.

Скіф.

Працэс Сялянска-Работніцкае Грамады.

Працэс пачаўся 23-га лютага. Пасьля шасьці дзён судовае расправы быў зроблены ад 1 да 12 сакавіка, на час выбараў у Сойм і Сэнат, перарыў. Ад 12 г. м. працэс адбываецца далей. Пратрывае ён, як падаюць віленскія газэты, каля двух месяцаў, г. зн. болш менш да траўня месяца. Па незалежных ад нас прычынах мы да гэтага часу не маглі даць патрэбнае справаздачы аб ходзе працэсу. Цяпер падаем коратка аб мінулых днёх працэсу, а далей пастараемся даваць справаздачу аб ходзе працэсу нармальна.

Як адбываецца працэс. Суд агаласіў, што працэс будзе адбывацца пры адчыненых дзьвярох, за выняткам надзвычайных выпадкаў, калі суд будзе вясьціся пры зачыненых дзьвярох. І праўда, у залі суда сядзяць прадстаўнікі прэсы і радня абвінавачаных паслоў, пару канфідэнтаў паліцыі, некалькі лаў зусім пустых. Каб папасьць на суд — трэба мець спэцыяльны білет-пропуск, інакш у залю ня пускаюць стаячыя каля дзьвярэй са штыкамі паліцыянты. Спробы-ж дастаць білет-пропуск на суд канчаюцца няўдачна, кажуць, што няма вольных месц.

Склад суда. Суд складаецца з наступных: асоб: старшыня суда А. Овсянко, судзьдзі А. Ёдзевіч, А. Борэйка і запасны Бжовоўскі; пракуроры: падпракуроры Калапскі, і Раўзэ; сэкрэтары: аплікант Коркуць і Одынец.

Абарона: адвакаты—Ян Бабянскі, Дурач, Эттынгер, Сьмяровскі і Гонігвіль з Варшавы і мясцовыя адвакаты: Абрамовіч, праф. Пятрусэвіч, Кшыжановскі, Сенкевічанка, Залкінд, Матыяш, Прайс, Раманкевіч і апліканты: Варашынскі, Марцінеўскі і Сольц.

Прэса: прадстаўнік „Тасс'а“ (радавае агенства)—Кавальскі, „Известий“ — Братін, Нью-Іорскага (амэрык.) „Forwerts'у“ — Вайнрайх, прадстаўнікі польскай варшаўскай і віленскай прэсы і прадстаўнікі беларускай і жыдоўскай мясцовай прэсы. Кідаецца ў вочы адсутнасьць менскае беларускае прэсы. Няўжо-ж Менск гэтым працэсам ня цікавіцца?

Першы дзень працэсу 23 лютага прысьвечаны пераклічцы падсудных і сьведкаў і прысязе апошніх. З 56 падсудных 55 беларусаў і 1 паляк. Большасьць з іх—праваслаўныя, частка каталікоў і бязьверных і адзін магамэтанін. Некалькі асоб падсудных з вышэйшай адукацыяй, больш з сярэдняй, і абсалютная большасьць сяляне, з пачатковай адукацыяй. Магамэтанін таксама называе сябе беларусам, што вельмі дзівіць суд. Усе падсудныя адказваюць пабеларуску і навет паляк Навакоўскі, што зноўжа вельмі дзівіць суд.

Склад падсудных: б. пасол Браніслаў Тарашкевіч, б. пасол Сымон Рак-Міхайлоўскі, б. пасол Павал Валошын, б. пасол Пётра Мятла, б. дырэктар Беларускай Гімназіі ў Вільні Радаслаў Астроўскі, Максім Бурсэвіч, Фабіян Акінчыц, Язэп Шнаркевіч — усе гэтыя абвінавачваюцца па 102 арт. часьць II, 51 і 110 К. К.;

Антон Луцкевіч, Аляксандар Коўш (сьвяшч.), Уладыслаў Навакоўскі, Аляксандар Міськевіч (Мір), Ян Кузьміч (Навагр. пав.), Клаўдзія Гоцько (Карэліцк. вол., Навагр. пав.), Мікалай Якімовіч (Горадня) Вінцук Шушкевіч (Горадня), Язэп Баліцкі (Горадня), Уладзімір Паддубік (Горадня), Павал Драгун (Горадз. пав.), Міхась Каўнак і Ян Кож (Пруж. пав.), Язэп Пашанчук (Пруж. пав.), Уладзімір Гмыр (Пруж. пав.), Васіль Шкодзіч (Ваўкав. пав.), Сьцяпан Шчыглінскі (Ваўкав. пав.), Уладзімір Харкевіч (Ваўкав. пав.), Сьцяпан Янкоўскі (Ваўкав. пав.), Аляксандар Патоцкі (Ваўкав. пав.), Ян Гелда (Сакольскі пав.), Аляксандар Зданюк (Сакольскі пав.), Павал Беламужы (Сакольскі пав.), Марцін Козіч (Сакольскі пав.), Сымон Саванец (Слонімскі пав.), Павал Якубчык і Сяргей Саванец (Слонімс. пав.), Міхал Якімовіч і Ігнась Шацько (Слонімс. пав.), Аляксандар Марчык (Слонімс. пав.) Антон Сакалоўскі (Глыбокае), Міхал Нікіфароўскі (Дзіс. пав.), Кастусь Лабунька (Дзіс. пав.), Сьцяпан Сцецік (Дзіс. пав.), Кастусь Шапіла (Дзіс. пав.), Міхал Шэвель (Дзіс. пав.), Тодар Варанкевіч і Ян Варанкевіч (Дзіс. пав.), Анатоль Даніловіч (Дзіс. пав.), Аляксандар Антановіч (Вялейск. пав.), Вінцук Салыга (Лідзкі пав.), Вінцук Крупіца і Ігнась Мармыш (Лідзкі пав.), усе гэтыя абвінавачваюцца па 102 арт. ч. II К. К.

Сьцяпан Куліна-Куліноўскі (Малад. пав.) абвінавачваюцца па 102 арт. ч. II і 111уст. I Кар. Код.

Сьцяпан Казачонак (Дзіс. пав.), Міхал Кавалёў, Ніканор Кавалевіч і Марк Карніловіч (Дзіс. пав.) абвінавачваюцца па 102 арт. ч. II і 49, 51, 499, ч. I уст. IV К. К. і 51, 455 уст. 12 К. К. і на арт. 207, 208 і 523 U. P. K.

Сьведкаў паклікана 660. Большасьць іх, больш за 400 паклікана з боку суда. Вялікая лічба з іх паліцыянты і канфідэнты, а таксама шмат урадоўцаў. Частка пакліканых сьведак з беларускага грамадзянства з Вільні і з вёскі. Беларусы пры пераклічцы і між сабой гавораць пабеларуску.

З 660 пакліканых сьведкаў 70 не зьявілася. Аказалася, што на заяву абароны аб пакліканьні цэлага шэрагу сьведкаў з боку абвінавачаных суд адказаў адмоўна. Дзеля гэтага абарона просіць паклікаць паданых ёю сьведкаў з боку абвінавачаных і, пакуль ня будуць пакліканы, адлажыць працэс. Тады старшыня суда абяцае пазваць усіх сьведкаў бегам працэсу—працэс-жа працягвацца.

Прысяга сьведкаў ідзе партыямі па 50 асоб. Тут зноў сьведкі-беларусы дамагаюцца прысягі пабеларуску. Суд гэта пазваляе. Але тут у вельмі прыкрое становішча трапляе сьвяшчэн., які сіліцца чытаць прысагу папольску, пабеларуску, але як у першым, так і ў другім выпадку, гаворыць невядома якой расейска-польска-беларускай мовай. Старшыня суда падказывае яму пабеларуску, але таксама ня надта ўдала, бо ўсё-ж прысягаючыя ня могуць паўтараць за ім неправідлова выказаныя беларускія словы, а гавораць пабеларуску.

Складаньне прысягі сьведкамі цягнецца аж да 12 гадз. ночы. На гэтым канчаецца першы дзень працэсу.

Другі дзень, трэці і чацьверты прысьвечаны чытаньню акту абвінавачаньня. Але скарочаньне акту абвінавачаньня мы падамо асобна. Цяпер-жа пяройдзем да пятага дня працэсу, у які пачынаецца дапрос сьведкаў.

Пяты дзень працэсу. Першым сьведкам якога дапытываюць, зьяўляецца М. Ясінскі, б. начальнік акруговага сьледчага ўраду ў Беластоку. Пасьля прысягі сьведка кажа, што пасьля ліквідацыі КПЗБ у Беластоку быў камандыраваны ў турму, дзе сядзеў Гурын, арыштаваны пры ліквідацыі КПЗБ. Гурын захацеў пагаварыць з афіцэрам паліцыі. За гэта ўзяўся сьведка Ясінскі. Гаварыў ён з ім у працягу 3 месяцаў. На аснове гэтых гутарак сьведка кажа, што Комінтэрн пастанавіў арганізаваць КПЗБ і выкарыстаць нац. меншасьці ў Польшчы дзеля сусьветнай рэвалюцыі. Дзеля гэтага было пастаноўлена стварыць Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду, N.P.Ch. і лявіцу P.P.S. У 1925 г. адбылася канфэрэнцыя ў Гданску, на якой быў Тарашкевіч. У кантакце з камуністамі, кажа Ясінскі, былі Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла, а Астроўскі быў кур'ерам. Так у кантакце з КПЗБ вялася ўся праца Грамады. У такім духу гаворыць сьведка Ясінскі ўвесь час, апіраючыся на тое, што сказаў яму Гурын, і на тое, што ён высачыў пры помачы тайнай паліцыі. Калі-ж абарона (адв. Сьмяроўскі, Дурач) дамагаюцца канкрэтных дадзеных у справе лучнасьці Грамады і КПЗБ — сьведка Ясінскі адказаць затрудняецца.

Далей дае паказаньні **сьведка Патрэба**, аўтар ліста да свайго брата, што жыве ў Савецкім Саюзе. У лісьце ён гаворыць аб былым тэрорі ў Польшчы і просіць прысла́ць 500 зл. на аплату адміністрацыйнай кары. Як высьвятляе пракурор Калапскі, сьведка Патрэба сядзіць у турме і мае справу па 102 арт. К. К., што сьведка на паказаньні ў сьледчага судзьдзі сьцьвердзіў кантакт Грамады з КПЗБ.

Дук Антон усе паказаньні супраць Нікіфароўскага апірае не на тым, што сам чуў, а кажа, што казалі Шульгі аб Нікіфароўскім.

Асьпірант паліцыі Васілеўскі гаворыць аб пашырэньні Грамады ў Віленшчыне. Сьцьвярджае кантакт Грамады з лявіцай ППС. На прэсу выдана 190.000 зл. Кіраваў прэсай Луцкевіч пад наглядам Гурына і Лагіновіча. Аднэй з пляцовак, падпіраючай Грамаду, быў і мэтодызм. „На Маланку“ даваў грошы Інбелкульт у Менску. Дзеля змучанасьці сьведкі — суд адкладвае справу да чарговага дня.

Шосты дзень працэсу 29 лютага. Працяг паказаньняў асьпіранта Васілёўскага, дапаўняе ўжо сказаныя на пярэдадні паказаньні і гаворыць аб маніфэстацыях камсамольцаў і грамадаўцаў у Вільні. На пытаньне адв. Гонігвіля, адкуль мае інфармацыі аб даных 15 і 30 тысяч даляраў на Беларускі Банк у Вільні, кажа, што ад Гурына і ад А. К. К. П. З. Б. у Вільні. **Тарашкевіч:** ці можна дапусьціць, каб такая паважная ўстанова, як Інбелкульт у Менску, была выдаўцом Гумарыстычнай „Маланкі“? **Сьв.**—калі ходзіць аб стварэньне фэрмэнту ў Польшчы дык так. **Луцкевіч:** Мяне вы лічыця за ідэёвага павадыра Грамады? **Сьв.** бязумоўна так. **Луцкевіч:** Дык не К. П. З. Б, а я кіраваў Грамадой? **Сьв.** *Я гэта не кажу.* Ведаю, што пан меў вялікія ўплывы на напрамак Грамады і не хацеў гэтага выкарыстаць. **Сьв.** цьвердзіў, што ўсе Беларускія ўстановы былі апанаваны Грамадой. Але, ня могучы вывязацца з усіх пытаньняў абароны на гэту тэму, кажа, што ня ходзіць толькі аб урады ўстаноў, а што і сябрамі ўстаноў былі Грамадаўцы.

Сьв. Глушын. Адбывае 3 гадовую кару. Адмаўляецца ад таго, што, як сказана ў Акце абвінавачаньня, гаварыў з Мятлой, які даручыў яму правясьці эвідэнцыю аружжа. Адмаўляецца ад таго, што быццам Мятла гаварыў яму аб паўстаньні і ад таго, што пры разглядзе на судзе яго справы падаваўся за конфідэнта паліцыі. Абарона ўнясла прапазіцыю, каб адбыўшуюся справу Глушына залучыць да справы. Суд прапазіцыю адкінуў, на аснове таго, што цяперашні Старшыня Суда быў старшынёй і на працэсе Глушына.

Далей дае паказаньні, як сьв., кіраўнік экспозытуры II аддз. гэнэральнага штабу маёр Мээр. Абвяшчаецца перарыў на час выбараў да 12 марца.

Свабодная думка і самаўладзтва.

Свабодная думка мае сваю гісторыю, поўную трагічных старонак. Многа свабодна думаючых людзей было забіта, замучана ў турмах, у ссылцы, у катарзе. Многа свабодна думаючых людзей не пашкадавалі ахвяраваць сваім свабодным думкам сваё жыцьцё, сваё шчасьце, бо свабодная думка нясе народную волю, а народная воля творыць жыцьцё. Народная воля творыць жывое, кіпучае, гарманічнае жыцьцё, гдзе кажды грамадзянін чуе сябе вольна і раздольна, і кажды імкнецца як найбольш украсіць, увабраць яго. Але самаўладцы ня лічацца ні з харастом жыцьця, ні з ініцыятывай народнай творчасьці, калі гэта пераходзіць граніцы іх „самадзяржаўнага" рассудку.

Усякі самаўладца, усякі дыктатар—гэта трус, які баіцца свабоднай думкі, бо свабодная думка разаблічае яго нягодныя паступкі. Усякі больш менш культурны чалавек робіць наадварот. Ён не баіцца здаровай крытыкі, але робіць з яе вывады, дзякуючы якім папраўляе свае памылкі.

Але самаўладца настолькі тупавушны, настолькі нізкі на розум, што ня можа зразумець гэтага, вялікай важнасьці, боку крытыкі. Ён верыць, што толькі яго думкі праўдзівыя і што яго паступкі непагрэшныя. Усё-ж па-за гэтым—памылкі і праступкі. Але ён ня лічыць за памылкі і праступкі сьціраць з твару зямлі навет сотні і тысячы людзей, што пазволяць сабе свабодна думаць і гаварыць.

А ці-ж не забойства нямота?

Чым больш людзі гавораць, тым больш яны развіваюцца; чым больш людзі маўчаць, тым больш яны тупеюць; яны робяцца раўнадушнымі да ўсяго акружаючага. Тыя, што не гавораць — ні людзі: гэта балваны, гэта калекі, горшыя аўтаматычнай машыны. Дзеля гэтага самаўладцам надта карысныя гэтыя людзі, а балваны, якія, рэлігійна злажыўшы на грудзёх рукі, пакорна гавораць: Амін! І як бы ня зьдзекавалася над імі самаўладзтва, як бы ня гнула іх у бараны рог, яны ўсёроўна будуць цьвярдзіць пакорна і паслушна: Амін!

У нядумаючых людзей, або думаючых на загаду другіх (не свабодна), думкі — тупыя, пачуцьці—забітыя. Вечна маўклівыя людзі ня ўмеюць пастаяць за сябе, за свой гонар і за сваю свабоду, бо ўсё гэта—для іх чужое.

Ня гэтакія людзі, якія думаюць і гавораць, разважаюць і дыскутуюць. Гэтыя людзі будзяць свае мазгі, варушаць свае пачуцьці і заўсёды дашукваюцца лягічных выбараў аб узаемадносінах у грамадзкім, людзкім жыцьці.

Яшчэ больш ясна ўбачым карысьць свабоднай думкі, калі спытаем: ці ўсе першыя паступы навукі, тэхнікі, мастацтва, музыкі і г. д. ня ёсьць прадуктам свабоднай думкі? Ці мелі-б мы цяпер усе гэтыя цэннасьці, калі-б людзі ня думалі і не гаварылі свабодна? Пэўна, што ня мелі-б.

Людзкую думку ня можна запэрці ў пэўныя рамкі, як ня можна забараніць птушцы лятаць, не скалечыўшы яе. Глыбока памыляюцца тыя, хто баіцца свабоднай думкі, свабоднага, гучнага слова і наогул свабоды.

Глыбока памыліліся цяпер польскія ўлады, ня даўшы Беларускаму народу свабодна выявіць сваю волю, пры астатніх выбарах у Польскі Сойм.

Глыбока памыліліся польскія ўлады, ня даўшы Беларускаму Народу свабоднага слова пад час гэтых выбараў, не дапусьціўшы да Беларускага Народу яго праўдзівай думкі, ні праз жывое слова, ні праз прэсу.

Не пачуўшы ўласнай думкі ні праз жывое слова, свайго чалавека, ні праз прэсу — Беларускі Народ быццам анямеў. Моўчкі ён слухаў тысячы насланых, думаючых і гаворачых па заказу, агітатараў. Моўчкі ён слухаў іх і моўчкі расходзіўся, чухаючы патыліцу, пакурваючы і сплёўваючы, а не злажыўшы рэлігійна рукі на грудзёх і ня кажучы: Амін!

Гэтае глыбокае, быццам мяртвецкае маўчаньне Нашага Народу паказвае, як глыбока адчуў Беларускі Народ сваю крыўду, якая адбірала ад яго яго чалавецтва, якая хацела зрабіць яго балванам, або, самае лепшае, калекаю яго страшэнна брыдка духоўна.

Гэтае маўчаньне яскрава паказвае, як моцна ў Беларускім Народзе свабодная ініцыятыўная думка і дух.

Вось чаму мы ня лічым сябе пераможанымі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Зьмены ў Урадзе.

На жаданьне самога маршалка Пілсудскага маршалкам новага Сойму мае быць віцэ-прэм'ер Бартэль. У лучнасьці з гэтым „przesunięciem" зьяўляецца пытаньне, хто будзе тады віцэ-прэм'ерам? Паводле газэтных вестак высоўваюцца дзьве кандыдатуры: гэн. Каз. Сосньковскі, гэн. Гурэцкі і д-р Каз. Сьвітальскі — дыр. палітычнага дэпарт. Мін. Унут. Спр. П. Сьвітальскі належыць да групы верных пілсудчыкаў. „Gaz. Warsz." падае апошнюю вестку—больш арыгінальную,—што мае быць утвораны „падсэкрэтарыят стану", кіруючы справамі прэзыдзіуму рады міністраў, а падсэкрэтаром стану мае быць той-жа д-р Каз. Сьвітальскі.

Пакуль-што запраўды трудна прадбачыць, хто будзе віцэ-прэм'ерам, бо ўсе гэтыя „przesunięcia" трымаюцца ў вялічэнным сэкрэце. Сам маршалак Пілсудскім свайго слова ў гэтай справе яшчэ не сказаў, — а трэба думаць, што вырашэньне гэтага пытаньня будзе залежаць ад яго.

Польска-Літоўскія перагаворы.

Польскі ўрад пераслаў Вальдэмарасу сваю згоду на вядзеньне перагавораў паміж Польшчай і Літвой.

Перагаворы маюць распачацца 30 г. м. ў Крулевцу. Калі старшыней літоўскай дэлегацыі будзе Вальдэмарас, то старшыней польскай—будзе мін. Залескі.

Устрыманьне Польска-Нямецкіх перагавораў.

З Бэрліна паведамляюць, што Нямецкая рада міністраў пастанавіла устрымаць польска-нямецкія гандлёвыя перагаворы і далейшы іх ход паставіць у залежнасьць ад будучага парляманту; так — што якая-небудзь пастанова ў гэтай справе паступіць толькі пасьля выбараў новага парляманту.

Нарады сярод „адзінкі".

Сярод паслоў з „адзінкі" відаць вялікае заклапатаньне: радзяцца ды перараджваюцца аб праграме і тактыцы ў новым Сойме. Да чаго прывядуць гэтыя нарады, пакульшто ня ведама;—адно пэўна, што пасольскі клюб „адзінкі" будзе адзін, сярод якога будуць паасобныя фракцыі — якія, яшчэ ня ведама.

Прапазыка ў Сойме аб звальненьні арыштаваных грамадаўскіх паслоў-беларусаў.

„Gaz. Warsz." апіраючыся на „Dzien. Wil." падае вестку, што на першым звычайным паседжаньні новага Сойму мае быць пададзена прапазыка аб скасаваньні суду процi Б. С. Р. Грамады і аб звальненьні арыштаваных грамадаўцаў на чале з пасламі.

Вялікія надужыцьці.

Па загаду дэлегата надзвычайнай камісіі дзеля барацьбы з надужыцьцямі, судзьдзі Ліндэрта, львоўская паліцыя аддала ўладам сьледчай турмы кіраўніка „Orbisu", Гэлену Матагову і Зьдзіслава Касьперскага.

Зроблена гэта ў сувязі з надужыцьцямі на школу дзяржаўнага скарбу на суму больш як на паўтара мільёны злотых.

Прысуд над рэдактарам.

Акружным пазнанскім судом асуджаны на 2200 злотые штрафу рэдактар нямецкай часопісі „Posener Tageblatt", Стыкэ, за абразу Саюзу Абароны Заходніх Крэсаў.

Цэны дзерава ў Польшчы.

Цэны дзерава ў Дзяржаўных Лясох, зьяўляючыхся рэгулятарам цэн сыр'я, растуць што месяц. На ўвагу заслужвае факт, што сярэдняя цана лесапільнага сасновага дзерава ўсталяецца на 70 — 80 злот, г. з. многа вышэй даваеннай цаны.

Гэта пацьвярджае апошняе апраўданьне міністэрства рольніцтва, па якім тартачная сасна ў Варшаўскай дырэкцыі каштуе 80 злот.; ў Радамскай 71 зл.; ў Белавежскай 60 зл.; Торунь 80 злот.

Адносна цэлай Дзяржавы — дзерава падаражэла ў сярэднім на 9 працэнтаў.

Гэта сама адносіцца і да будаўлянага сасновага матэр'ялу, які падаражэў на 20 прац.

Гэтае падаражэньне за адзін месяц — прост апаламяючае.

З эканамічнага жыцьця Віленшчыны.

Па пастанаўленьні віленскага суда, 18 траўня прадаюцца з аўкцыёну мясныя крамкі Р. Курачэўскага.

17 верасьня ўсадзьба на рогу вуліц Тартакі і Якуба Ясінскага (А. Гардона).

18 траўня маёнтак М. Нагурскага (Вольша, Валожынскага павету); усадзьба Янкі і Вяронікі Міхайлоўскіх (Закротовая 13) і маёнтак Ліпнягі (Зялёны Луг) Дзісьненскага павету К. Багуцкага.

Безрабоцьце ў Польшчы.

Паводле дадзеных дзяржаўных бюраў пасярэдніцтва працы, апошняя тыднёвая справаздача з рынку працы за час ад 3 да 10 сакавіка г. г. падае: 176.584 безработных зарэгістраваных у П.У.П.П., у тым ліку — 38.276 безработных кабет.

З Беласточчыны.

Акружны суд у Беластоку засудзіў на кару сьмерці Аляксандра Бойко за забойства брата вядомага беларускага генарала Балаховіча. Тры вучасьнікі, Бартосяк, Арцішэўскі і Лешчук засуджаны на бясрочную катаргу. Забойства было ў 1925 г.

Новы падатак.

31-га красавіка камінарнікі абавязаны плаціць у магістрат новы падатак, па 20 злотых у год.

Заграніцай.

Прапазыка СССР аб поўным разбраеньні.

На адбыўшымся ў Жэнэве 19 г. м. паседжаньні прыгатаваўчай камісіі міжнароднай канфэрэнцыі па разбраеньню кам. Літвінов, прадстаўнік СССР, злажыў прапазыку Радавага Саюзу, датычачую агульнага і поўнага скасаваньня аружных сілаў як сухапутных марскіх, так і паветраных.

Веча у Парыжы у справе беларускай „Грамады".

Украінская часопісь „Новий Час" (Львоў, 16-га сакавіка с. г. № 35) зьмяшчае наступную карэспандэнцыю з Парыжа, якую падаем дасло̆ўна:

„У Парыжы становяцца ў абароне беларускай „Грамады".

„У Парыжы, у Францыі, істнуе г. зв. „Камітэт для амнэстыі", мэтай якога ёсьць палягчэньне долі палітычных вязьняў у г. зв. капіталістычных дзяржавах. Праваднком гэтага камітэту ёсьць вядомая радыкальная дзеячка, гр. Северэн, сябрамі—выдатнейшыя левыя францускія палітыкі. Гэты камітэт уладзіў на днях вялікае веча ў Парыжы ў справе працэсу беларускай „Грамады" ў Вільні. Веча адбылося ў прысутнасьці вялікіх масаў парыскага насельніцтва. Пасьля вельмі бурлівых прамоваў, у якіх прамоўцы абвінавачвалі польскі ўрад, ухвалена выслаць да Пілсудскага тэлеграму з дамаганьнем неадкладна прыпыніць віленскі працэс „Грамады". Адначасна выслана тэлеграму да галоўнага абвінавачанага ў працэсе б. беларускага пасла Тарашкевіча, перасылаючы яму „братэрскі прывет францускага грамадзянства", ды запэўняючы яго „ў цьвердай волі гэтага грамадзянства дапамагчы беларускім грамадзянам у іхнай барацьбе за правы чалавека".

Вайсковае прыгатаваньне жанчын у СССР.

У ўрадавай савецкай палітыцы стала адзначаецца моцнае падкрэсьліваньне канечнае патрэбы прыгатаваньня жанчын дзеля абароны краю. У адумысна дзеля гэтага ў з'арганізаваных паветраных і хімічных саюзах ёсьць ужо запісаных 400.000 жанчын. Адмак-жа урад рупіцца знайсьці для гэтай мэты, як можна больш жанчын. Дзеля гэтага будуць заложаны спэцыяльныя ўстановы, маючыя на мэце прыгатаваць жанчын да службы мэтэоролёгічнай, гаспадарчай, да процігазавай абароны і газавай вайны, да службы сувязі і г. д. Саветы маюць намер прыгатаваць жанчын і да працы фабрычнай, каб на выпадак вайны яны маглі заступіць у прамысловасьці мужчын. Апрача гэтага, Саветы думаюць выхаваць давераныя ім кадры жанчын, якія-бы падчас вайны ўтрымлівалі пастарункі пры складах амуніцыі і за фронтам і ўрадаваць ў глыбіні краю у ўсякіх вайсковых установах.

З жыцьця СССР.

Народны камісар вайсковых спраў СССР Варашылаў у абвешчаньні ува ўсіх савецкіх часопісях загадзя злажыў падзяку таварыству „Осрав'яднум" за 65 аэраплянӑў, пераказаных ў дзень 10 угодкаў чырвонай арміі. Гэтыя аэрапляны, як і 30 ужо папярэдня пераказаных, выбудованы на дабравольныя складкі фонду: „Наш адказ Чэмбэрлену".

Нямецка-радавы канфлікт.

Нямецка-радавыя торговыя перагаворы, пасьля якіх Саюз Радавых Рэспублік меў дастаць ад Нямеччыны пазыку, раптам былі пярэрваны. Прычына зрыву перагавораў даволі дзіўная і мала паважная:—сталася гэта, як адказ Нямеччыны на арышт Радамі некалькіх нямецкіх інжэнераў у Данецкім басэйне, якім радавая ўлада закідае сабатаж і контррэвалюцыйную працу.

Трудна думаць, што запраўднаю прычынаю зрыву торговых перагавораў зьяўляюцца гэтыя арышты;—прычына тут глыбейшая, арышты-ж толькі повад да зрыву. У ацэнку гэтага факту пакуль-што ўдавацца ня будзем.

Уся буржуазная прэса страшэнна зада-

СТРАХ.

— „Здароў, Язэп! Што ты тут parabляеш"?

— „Ды вось прадаў карову і зьбіраюся да хаты ісьці".

— „Э, хата не ўцячэ! Пойдзем падвячоркаваць, а пасьля разам паедзем, бо я маю каня за ракой. А да таго ж, як-жа гэта так, суседзе: прадаў карову і паўбутэлькі паставіць ня хочаш"?

— „Ды й ты-ж, Янка, хіба ня так прыяжджаў, а нешта-ж напэўна прадаваў, дык выходзіць, што ад абодвых належаць барышы"?

— „Але, праўда, прадаў трошкі лёну; трэба, хвароба іх, падатак заплаціць".

— Ах, і не ўспамінай мне аб гэтых падатках: ці-ж, думаеш, кароўку прадаў ад збытка? Змусілі, бо хацелі апісаць".

— Так, цяжкія часы насталі! Але што-ж ты парадзіш? Прыходзіцца цярпець. Пойдзем з гора да па дзядоўскаму звычаю зробім па чарцы нейкай".

— „Яно-то варта было-б адвыкаць ад гэткіх дрэнных звычаяў, але што-ж з табой зробіш! На сяньня згода, бо неяк нудна на сэрцы. А куды зойдзем"?

— „Ды хоць-бы і да Воркі. Якраз там і конь мой стаіць".

Два суседы хутка апынуліся на дзядзінцу Воркі, дзе сярод дзесятка паўтара сялянскіх коней стаяў і Янкаў конь. Падкінулі сена, аглядзелі калёсы і пакіраваліся ў хату.

Тут ужо амаль-што ўсе каморкі і сталы былі заняты. Старанна прыслужвала сваім гасьцём Сорка, жонка Воркі, якая памінутна выбягала да кухні і прынасіла то сялядцы, то поўныя талеркі сітніку. Заўважыўшы Язэпа й Янку, яна ветліва ўсьміхнулася да іх, як да добрых знаёмых, і загаманіла:

„Пэўне хочаце падвячорак з'есьці? Але, выбачайце, пакуль-што няма месца".

— „Ды нам дзе-небудзь хоць на канцы стала—сказаў Янка.—Вось Язэп прадаў карову, дык хоча паставіць барышу.

— „Так бы адразу гаварылі! Гэта — іншая рэч! Калі так, то хадзіце вось сюды, у гэтую каморку, тут ёсьць вашы суседзі — паміріцеся неяк".

Сорка, што праўда, даволі ветліва прынімала ўсіх гасьцей, але да тых, якія мелі грошы, ды маніліся выпіць, была ў яе асаблівая пашана. Давалася ім зацішная каморка, дзе на скрыпячай і бруднай канапе, або на табарэтках, за такім-жа брудным сталом усаджваліся госьці і пачыналася выпіўка.

Увашоўшы ў адну з такіх каморак, Янка з Язэпам угледзілі суседаў Васіля з Грыгорам, якія пасьпелі ўжо апаражніць паўбутэлек і ў якіх ужо „чмялі ў галаве" трохі гудзелі.

„Як маецеся, суседзі! — закрычаў Грыгор.—Вось добра, што прышлі, а то мы не маглі вырашыць аднаго пытаньня: піць другую паўбутэльку, ці не"?

— „Ведама-ж не на адной назе скакаць — адказаў Янка. — Вось і мы прышлі трошку перакусіць, ды пабалавацца нямножка з чаркай".

— „Дык давайце зробім адну кампанію—запрапанаваў Васіль—весялей будзе".

— „Добра, добра".

Сорка добра ведала свой абавязак. На стале зараз-жа зьявілася талерка з сітнікам, а другая—з чатырмя селядцамі. Язэп пашаптаў нешта на вуха і праз хвілю вярнулася Сорка з бутэлькай „манаполькі", якая зараз-жа апынулася на стале.

„Ну, дык нечага марудзіць, пачынайце", прапануе Янка.

Ударыў далонёй Язэп у пятку бутэлькі, выбіў корак з рыльца і наліў чарку. Тройчы перахрысьціўшыся, пагладзіў бараду, і, пажадаўшы здароўя Грыгору, апаражніў яе. Пачатак аказаўся на столькі шчасьлівы, што далей ужо не патрэбна было ні напамінаць, ні прасіць. Праз паўгадзіны на стале апынулася Янкава бутэлька, а там... Хто-ж яго ўспомніць? Гэты сэкрэт вядомы быў хіба адной Сорцы, якая разлічалася са сваімі гасьцямі, пры дапамозе Воркі, усадзіла іх на калёсы і выправіла да дому. Язэп адно толькі добра помніў, што Сорка і Ворка здаваліся яму найлепшымі людзьмі. У знак прыязьні і шчырага задаваленьня лез цалавацца, але гэта яму якось не ўдавалася. Апынуўшыся на калёсах, ён заўважыў з боку Янку, які трымаў у руках лейцы і пугу і кагось-ці заядла лаяў.

— „А, браток, Язэпка! — абрадаваўся Янка, угледзіўшы сябру—што ты тут робіш"?

— „Еду, дамоў еду"! адказаў Язэп.

Конь, выведзены Воркам на вуліцу, мерным трушком пабег да хаты. Язэп з Янкам адчувалі сябе найшчасьлівейшымі з людзей. Выцягнуўшыся на калёсах і палажыўшы галовы, пачалі сьпяваць на ўсё горла.

Кароткі вясеньні дзень кончыўся яшчэ тады, калі нашы суседзі сядзелі за сталом Воркі. Настала цёмная ноч. У паветры пахла сырасьцю. Дзе-ня-дзе праз шчылка бегучыя хмаркі выглядалі зоркі. Дарога, чым далей ад мястэчка, тым станавілася горшай. Не паганяны нікім конь ня бег ужо трушком, а паволі нага-за-нагой цягнуўся па дарозе. Калёсы скрыпячы западалі ў калдобіны і з трудом перакатваліся колы, брызгаючы вадой і балотам.

Спачатку было шумна і вясёла. Спазьніўшыяся гаспадары амаль усе былі выпіўшыя. У паветры стаяў шум і гоман. Адзін паганяў каня, каб абагнаць суседа, крычаў, гойкаў,—другі не даваўся. На іншых калёсах ляжалі, як мерцьвякі, за тое з другіх падвод нясьліся нястройныя, п'яныя сьпевы. Па меры аддаленьня ад мястэчка лік падвод на дарозе зьмяншаўся і станавілася ўсё цішэй і цішэй. Нарэшце і Янка з Язэпам угаманіліся і, абняўшыся, крыху задрамалі.

Праехалі ўжо вёрст з восем. Сьцюжа й вецер крышку працьвярозілі суседаў. Янка прыпадняўся на локці, паглядзеў зьдзіўлёнымі вачмі наўкола і спытаў:

„Язэп, гэта ты"?

— „Я! — пачуўся сонны голас Язэпа. А хто мяне пытае"?

— Ды я, Янка! Ці-ж не пазнаеш"?

— „Вось яно што"?!

Пры гэтых словах Язэп прыпадняўся крыху і абапёрся на локці. Мутнымі, заспанымі вачыма паглядзеў на Янку, на каня.

„Скажы, браток, якім гэта чынам мы тут апынуліся і дзе гэта мы знаходзімся"?

— „А ліха яго ведае! Здаецца як быццам пад'езжаем да нашага магільніка".

— „Да магільніка? дзе зданьні здаюцца?"—спалоханы прагаварыў Язэп.

Папробаваў ён прыпадняцца, каб пера-

волела з гэтага канфлікту, робячы ўсё магчымае, каб папсаваць нямецка-радавыя адносіны.

Апошнія газэтныя весткі падаюць, што нямецка радавыя адносіны не павінны зьмяніцца.

Камітэт абароны Грамады ў Усходняй Беларусі.

Польскія газэты пісалі, што ў беларускім Менску с'арганізаваўся камітэт абароны Грамады пад старшынствам беларускага паэта Янкі Купалы; у склад камітэту ўваходзяць: беларускі паэт Якуб Колас, рэктар менскага беларускага ўнівэрсытэту Пічэта і іншыя.

Цяпер ізноў паведамляе „Głos Prawdy“ з дня 17/III, што паўстаў у Менску Цэнт. Выканаўчы Камітэт Абароны Грамады. На чале камітэту стаіць бышы пасол у польскі Сойм М. Кахановіч. У Усходняй Беларусі адбываюцца мітынгі, на якіх выносяцца пратэсты проці працэсу Грамады.

Забастоўка ў Нямеччыне.

Змаганьне за час працы і падвышку платы ў Нямеччыне што час заваетраецца.

Паседжаньне 700 гарняцкіх дэлегатаў Руры вынясьлі рэзалюцыю, жадаючую падвышэньня платы і зьмяншэньня лічбы гадзін працы. Закліканы ўправа фэдэрацыі гарнякоў, дзеля адмовы ад абавязуючай яшчэ ўмовы з дня 30 сакавіка.

У мэталюргічнай прамысловасьці сярэдня-нямецкага прамыслу забастоўка ахапіла каля 50.000 работнікаў. Адначасна сталёўні гэтых акругоў выдалі ўсіх работнікаў, не згадзіўшыхся на нормы ўсталеныя раз'емчай камісіяй, адкінутыя ўсімі прафэсіянальнымі арганізацыямі.

Трэба зазначыць, што наміма добрай эканамічнай сытуацыі становішча работнікаў у Нямеччыне надта цяжкое, з прычыны нізкай заработнай платы. Калі параўняць цэны наагул, дык работніцкія платы меншыя за перадваенныя.

Выбары ў Нямеччыне.

Выбары ў нямецкі рэйхстаг адбудуцца 20-га траўня.

Узнаўленьне нямецка-літоўскіх перагавораў.

Бэрлінская прэса паведамляе, што нямецка-літоўскія тарговыя перагаворы маюць распачацца ў другой палове сакавіка.

Забурэньне ў Эгіпце.

Падчас вялікіх непарадкаў у Каіры было зрабавана 14 магазынаў, з якіх—8 належала англійцам. Натоўп заатакаваў пастарунак паліцыі і вызваліў арыштаваных студэнтаў.

Пратэст Эгіпцян.

Эгіпцяне, прабываючыя ў Нямеччыне і ў іншых эўрапэйскіх краёх, выставілі да Чэмбэрлена вялікі (зборны) пратэст, проці агрэсыўнай (захопнай) калянізацыйнай палітыкі англійскага ўраду ў Эгіпце.

У гэтым пратэсьце Эгіпцяне пагражаюць, што такая палітыка можа быць у хуткім часе прычынай катастрофы Англіі і на Усходзе, бо ўвесь мусульманскі сьвет будзе імкнуцца скінуць англійскае ярмо.

Падобны-ж пратэст выставілі Эгіпцяне да сэкр. Лігі Народаў, дамагаючыся помачы сваёй акцыі ад Лігі.

Выбары ў Францыі.

З Парыжа паведамляюць, што новыя выбары ў француськую палату дэпутатаў назначаны на 22 га красавіка. Выбарная кампанія ўжо ў поўным разгары.

Першае паседжаньне новага парляманту адбудзецца 1 га чэрвеня.

Францыя і Італія плацяць свае ваенныя даўгі.

Францыя заплаціла на рахунак сваіх ваенных даўгоў Англіі частку за першае паўгодзьдзе г. г. ў суме 3 мільёнаў фунтаў, а Італія заплаціла 2 мільёны фунтаў.

„Свабода“ выбараў.

На адным з апошніх паседжаньняў французскага парляманту камуністы і сацыялісты зрабілі вялікую дэманстрацыю. Абгаварвалі інтэрпэляцыю сацыялістаў, якія выступілі ў абароне камуністаў, дамагаючыся з вастрогаў камуністычных паслоў, каб даць ім магчымасьць весьці выбарную акцыю.

Міністар справядлівасьці Барту заявіў, што ўрад не выпусьціць з вастрогу камуністычных паслоў; і калі-б камун. паслы Дорыо і Дюклё вярнуцца ў Францыю, урад не затрымаецца арыштаваць іх.

Барту зажадаў адказу супраць над інтэрпэляцыяй сацыялістаў, ставячы гэта з рукам даверыя ўраду. Парлямант прыняў прапазыцыю міністра 350 гал. проці 150. Як бачым, таксама і ў Францыі выбары лічацца свабоднымі толькі не для ўсіх.

Забастоўка кінэматаграфаў у Югаславіі.

Саюз уласьнікаў сьветавых тэатраў пастанавіў зачыніць усе кінэматаграфы ў цэлай Югаславіі.

Повадам гэтага вялікія падаткі накожаныя ўрадам на ўласьнікаў кін. Забастоўка мае трываць аж да зьмяншэньня падаткаў. Дзякуючы забаст., утраціці працу 6000 работн.

Забурэньні беспрацоўных у Нью-Іорку.

У Нью-Іорку здарыліся першыя забурэньні беспрацоўных. У адной з часопісаў было абвешчаньне аб пасадзе ганца (разносчыка) з пэнсіяй 16 даляраў у тыдзень. Перад канцылярыяй зьявілася каля 1.500 беспрацоўных мужчын і жанчын, якія сіліліся ўбурыць памешканьне канцылярыі, даведаўшыся, што пасада ўжо занята. Але браніраваныя аўтамабілі паліцыі разагналі натоўп.

Грэцыя шукае ката.

У грэцкіх турмах знаходзіцца 29 чалавек, асуджаных на сьмерць, але выканаць прысуд не магчыма, бо ў Грэцыі няма ката. Устава прадбачыць кару сьмерці праз гільятыну і толькі ў апошніх гадох выконвалася кара сьмерці праз расстрэл. Цяпер жа ваенны міністар спрацівіўся ўжываньню войска для расстрэльваньня, уважаючы гэта за абнязаканьне жаўнераў. Але як грэкі прызнаюць большасьцяй вэндэту (крывавую помсту), то катам ня можа быць грэк. Дзеля гэтага грэцкі ўрад абвясьціў публічны конкурс на пасаду ката.

Маніфэстацыі ў Грэцыі.

З Афінаў паведамляюць, што там пасьля палітычных мітынгаў многатысячныя грамады камуністаў маніфэставалі на вуліцах места, не разыходзячыся нават пасьля заклiку паліцыі. У пачатку пяялі маніфэстуючыя песьні Інтэрнацыянал, а крыкамі пачалі кідаць камяньнямі і крэсламі ў паліцыянтаў. Паліцыя разганяла маніфэстантаў, б'ючы народ прыкладамі стрэльбаў. 2 афіцэры жандармэрыі былі ранены. Рад асоб арыштавана.

Апазіцыя ў Румыніі дамагаецца адстаўкі ўраду і новых выбараў.

У Бухарэшце адбыўся многалюдны мітынг з ініцыятывы народнай сялянскай партыі. Мітынг гэты вызваў маніфэстацыю проці цяперашняга ўраду, каб выклікаць урадавы крызіс.

Усе прамоўцы дамагаліся адстаўкі ўраду, вызначэньня новых выбараў і дапушчэньня Маню на становішча старшыні ўраду. Пасьля прамоваў прынялі рэзалюцыю ў гэтым жа духу. У канцы на галоўных вуліцах места адбылася дэманстрацыя са сьцягамі і транспарантамі. Улада ня ставіла супраціву дэманстрацыі.

«Беззямельныя» міністры, генэралы, дактары, аптэкары і паслы, якія, на падставе „зямельнай рэформы“, атрымалі зямлю.

Ужо надзельваюць бяззямельных зямлёй ня толькі на нашых „крэсах“, але і ў самай Польшчы.

Вось хто на падставе „зямельнай рэформы атрымаў у Польшчы надзел зямлі.

1. Ян Рачынскі (колькіразовы міністар земляробства) асяродак Дамброва ў Гарвалінскім павеце—90 моргаў.

2. Зьдзіслаў Людкевіч (былы міністар, цяпер кандыдат з „ядынкі“).

3. Ст. Лончыньскі (цяпер сэнатар, старшыня Акружнога Земскага Ураду), асяродак Патрошыцаў, у Мяхоўскім павеце—95 марг.

4. Мікулоўскі-Паморскі (былы міністар), асяродак Бжэгі, у Енджэёўскім павеце — 90 маргоў.

5. Генэрал Язэп Галлер, асяродак Гарэхава, у Хэлмінскім павеце—230 маргоў.

6. Вехлаў Чэрніцкі (былы вызваленец, выш. ўрадовец), асяродак Казіная Гара, у Хэлмінскім павеце—95 маргоў.

7. Зьбігнеў Бардэль (сын былога міністра), асяродак Камаровец у павеце Бяла—46 марг.

8. Генэрал Вл. Сікорскі (былы старшыня міністраў), асяродак Парханьне ў Інаўраццлаўскім павеце—95 маргоў.

9. Раман Дмоўскі (правадыр эндэкаў, былы міністар), асяродак Хлюд ў Пазнанскім павеце.

10. Л. Леваньскі (прамысловец), асяродак Заборышкі, Сувальскага пав.—90 маргоў.

11. М. Белабжэскі (аптэкар), асяродак Сакольнікаў, Віленскага павету

12. М. Осецкая (крэўная або жонка Осецкага, пасла-міністра) асяродак Бамкі, Келецкага павету.

13. М. Выслоух (крэўны сэнатара Выслоуха), асяродак Хлевінчэ, Дарагабычаўскага павету.

14. Я. Чалбоўскі (брат міністра Чалбоўскага) асяродак Сьмілковэк, Няшаўскага пав.

15. І. Ромонец (старшыня Земскага Ураду) асяродак Туркавічы, Турэцкага павету.

16. Нелос Нёрбы (вышэйшы ўрадовец), асяродак Велёнткі, Пултускага пав.—110 м.

17. Зб. Дэмэль, асяродак Слупя, павет Скерневіцэ—85 маргоў.

18. Ф. Костро, асяродак Мінты, Кольскага павету—120 маргоў.

Далей ідзе сьпісак беззямельных дактароў. Наперадзе І. Косіньскі і Т. Кіселеўскі, атрымаўшыя асяродкі.

Далей ідзе сьпісак вышэйш. урадоўцаў Міністэрства Зямельных Рэформаў. Наперадзе: В. Морыс, І. Зеракоўскі, І. Штурм, Улад. Крачуньскі, І. Каспрэвіч.

Далей ізноў сьпісак генаралаў. Наперадзе Вл. Яцына, І. Врочыньскі, Паплаўскі, Спрыняевальд, Ястшэмбскі, Войніч-Акроневіч, Бэрбэцкі (кандыдат з „адзінкі“ і г. д.

Гэтак польская прэса „Wiadom. Chłopskie“ налічае 300 „беззямельных“ міністраў, генаралаў, дырэктараў, дактароў, аптэкароў.

„Międzynarodówka a proces „Hromady“.

Пад гэткім загалоўкам „Dziennik Wileński“ з дня 16.III № 62 падае аб рэсе, якое адчулася заграніцай у справе працэсу „Грамады“.

Ніжэй падаем дасло́ўны зьмест вышэйшага загалоўка без усялякіх каментарыяў:

„Помняцца яшчэ выступленьні і агітацыя з прычыны італьянскіх анархістаў Сакко і Ванцэтті, якія амэрыканскімі судамі былі асуджаны на сьмерць за зробленае забойства. Нешта падобнае пачынаецца ў адносінах да працэсу „Беларускае Грамады“.

Расейская прэса пеніцца, заклікае да выступленьняў, зьбірае складкі на „Грамадзістаў“.

„У сучасны мамэнт на арэну выступіла „парыская міжнарадоўка“. Вось у салі „Вялікага ўсходу“ ў Парыжу сабраліся ў камплекце: „апашэ“, драпіхрусты“, „санкаюлоты“ і іншыя каналіі над кіраўніцтвам Моркса Лаціна, і пры ўчасьцьці дэлегата ад польскага сялянства(!?) Станіслава Баліна, ухвалілі выслаць дэпэшу да маршалка Пілсудскага прэзэса Акаужнага Суда ў Вільні і г. д. з дамаганьнем (так!) мамэнтальнага спыненьня працэсу і выпушчэньня вязьняў на вольнасьць.

Напэўна па гэткім выступленьні пасыплюцца і іншыя, у Мэксыцы напрыклад... у Лізе Абароны Чалавека і г. д.“.

Трэба дадаць, што ня брак у гэтым сьпісе і паноў паслоў-людоўцаў, ухваліўшых у Сойме гэтую рэформу. Знаходзяцца там прозьвішчы: пасла Вільконьскага (былога пястоўца, былога вызваленца, былога Домбчыка), пасла Тадавуша Недзельскага (былога вызваленца, былога Домбчыка, цяпер кандыдата „адзінкі“) б. пасла Цекота, б. пасла Путры і г. д.

І вось ні адзін орган ніводнай з партыі гэтых паслаў, ні Вызваленьня, ні „Стронніцтва Хлопскага“, ні Акунёўцаў ані Пястоўцаў не асьмеліўся абвясьціць ні аднаго прозьвішча свайго пасла, атрымаўшага зямлю ў „rdzennej“ Польшчы. Мусіць, яны прашлі моўчкі гэтага з баязьні або са стыда перад працоўным польскім народам, што зрабавалі гэтую зямлю ў беззямельнага і малазямельнага польскага селяніна, а не ў дзікара (няўмеючага абрабляць зямлі) вялікай, бязмежнай Сібіры сучаснай Польшчы— не на „крэсах усходніх“.

Запраўды, надта цікава, чаму гэтыя вышэйшыя ўрадоўцы, людзі з найвышэйшай культурай, не атрымалі гэтай зямлі ў бязьмежнай цяперашняй польскай Сібіры—у нашых „дзікіх“ крэсах усходніх?

Ці гэта сталася дзеля таго, што на „крэсах“ ужо забракла зямлі пад вышэйшую культуру, ці мо' дзеля таго, што й „rdzenna“ (каранная) Польшча гэтакая-ж самая дзікая, дык трэба ратаваць перш яе, бо ведама-ж „свая кашуля заўсёды бліжэй да цела“?

хрысьціцца, але адрантвелая рука не паслухалася і ён ізноў паваліўся на норат.

„Ха-ха-ха!—зарагатаў Янка — бачу, што ты баішся? А я вось нічога не баюся. Няхай хоць усе мерцьвякі выходзяць.

— „Ды кінь ты плявузгаць! — са страхам прагаварыў Язэп — бачыш ноч. У гэты час — кажуць — душы грэшнікаў не знаходзяць супакою і блукаюцца па сьвеце“.

— „Ну калі грэшнікаў толькі, то згаворымся, бо-ж і мы пры сваей беднаце хіба-што ня ў рай пападзем“, жартаваў Янка.

У гэты час нешта драпанула Язэпа за вуха.

„Ды перастань ты жартаваць і, калі ласка, не чапай мяне!“ расьсердзіўся Язэп.

„А хто цябе чапае“?

Праз хвілю нешта стукнула па шапцы Янкі. Прыпадняўся вышэй, паглядзеў зьдзіўлена на Язэпа. Ізноў нешта скрабанула Язэпа на плячу і адначасна стукнула Янку ў бок. Падскочыў і Язэп. Глянулі адзін на аднаго, паглядзелі наўкола. Якраз праяжджалі каля магільніка. Хоць было і цёмна, але прывыкшымі ўжо да цемнаты вачыма, угледзілі яны некалькі крыжоў, якія выдзяляліся з гушчы кустоў. Ціха наўкола. Чулася толькі сапеньне каня, шлёпаньне па балоту капыт, ды шуршаньне колаў.

А тым часам штось час-ад-часу паскубвае то аднаго, то другога. Пагналі каня. Чым шыбчэй стаў бегчы конь, тым мацней і часьцей сталі адчуваць ужо ня скубаньне, а сапраўднае сьцёбаньне. Спалохаўся і Янка. У абодвых валасы сталі сторчма, прайшоў астатні хмель. Ад балючых udaraў пугі, нясецца конік са ўсіх чатырох ног.

Ну вось і вёска, з грукатам калёсы падкатываюцца пад ганак. Выскакваюць хлапцы спатыкаць бацьку. Што за ліха, ляжыць і не варушыцца? Бачаць на калёсах і яшчэ кагось. Падумалі, што п'яныя і пасьпяшылі абодвых унясьці ў хату.

У папутчыку Янкі пры сьвеце лямпы прызналі суседа Язэпа. Спрыснуўшы некалькі раз вадой, удалося нарэшце ачуціць сяброў. Як няпрытомны, сядзеў на ўслоне ў кутку Язэп і дрыжаў, як асінавы ліст. Хутчэй прыйшоў да памяці Янка. Стаў расказваць аб здарэньні. Дзівіліся дамашнія і ніяк не маглі зразумець, якое ліха спалохала іх бацьку і Язэпа. Парашылі нарэшце на тым, што напэўна душа Апанаса, які нядаўна павесіўся, напамінала аб сабе, вымагаючы малітваў.

На другі дзень Антось, сын Янкі, хацеў зацягнуць калёсы ў павецку. Узяўся за аглоблі, тузануў і ледзь з трудом скрануў калёсы з месца, як быццам бы хтось прытрымліваў. Агледзеў калёсы і заўважыў, што ў задніх колах заблуталіся даўгія бярозавыя дубцы, якія затрымліваючы ход, то падымаліся над калёсамі, то ізноў спушчаліся ўніз. Тут Антось зразумеў і прычыну ўчарашняга бацькавага і Язэпавага страху. Пазваўшы іх, ён на практыцы паказаў, як гэта рабілася. А старэйшы сын Янкі Лявон дадаў: „Усё гэтая праклятая гарэлка нарабіла“.

Часта сьмяяліся суседзі з Язэпа і Янкі, напамінаючы ім сьцябаньне бярозавых дубцоў. Яны-ж з гэтага дня сталі рэдкімі гасьцямі Соркі і хоць ведалі сваю памылку, але стараліся ўначы далёка аб'яжджаць магільнік.

Пётра Чабор.

Наша хроніка.

Сход Беларускага Грамадзянскага Сабраньня. Урад бышага Беларускага Грамадзянскага Сабраньня просіць прыйсьці на агульны сход Грамадзянскага Сабраньня, які адбудзецца 27-га сакавіка 1928 г. у 5 гадз. ўвечары па Віленскай вул. № 12—6.

Калі кворум сходу не зьбярэцца ў 5-й гадз., то праз гадзіну, г. ё. у 6-й гадз. сход будзе лічыцца правамоцным пры ўсялякім ліку сяброў.

Парадак дня: Выбары ліквідацыйнае Камісіі Грамадзянскага Сабраньня.

Урад Быўш. Грам. Сабраньня.

Калі адбудзецца адчыненьне новага Сойму. Газэты паведамляюць, што ўжо ёсьць пастанова, каб урачыстае адчыненьне новага Сойму адбылося на Замку 27 г. м. у 12 гадз. дня. Прэзыдэнт мае сказаць прамову да новых паслоў; — старшынстваваць там будзе найстарэйшы з паслоў, пасьля прамовы Прэзыдэнта паслы зложаць прысягу. У той самы дзень адбудзецца першае паседжаньне Сойму ў соймавым будынку і будзе выбраны прэзыдыум новага Сойму.

Арышты у Зах. Беларусі. Перад выбарамі, у часе выбараў і пасьля выбараў адбыліся значныя арышты ў Заходняй Беларусі. Польскія газэты цьвердзяць, што арышты адбыліся ў сувязі з ліквідацыяй Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У Стаўпецкім павеце арыштавана 27 асоб. Між іншым арыштавана Алёна Лябецкая сэкрэтарка Слонімскай Акружнай Управы Т-ва Беларускае Школы, Міхал Пігер, Павал Крынчык, Аляксей Баль і інш. У пав. Лідзкім і Навагрудзкім арыштаваны: Уладзімер Грыц, Антон Малеяў і Аляшкевіч; усе, як кажа „Кур. Віл.“, сябры КПЗБ і Грамады.

Усяго ўжо арыштавана 200 асоб.

Арышты ў Дзісьненскім пав. Яшчэ перад выбарамі ў Сойм пракацілася хваля арыштаў па Дзісенскаму павету. Арыштаваны ў Глыбокім Скурка, загадчык аддзелу Беларускага Каапэр. Банку ў Глыбокім і інш. Арыштаваны таксама ў Вільні рэдактар „Сахі“ грам. Павалковіч. Арыштаваныя сядзяць яшчэ да гэтага часу.

Арышты ў Лідзе. Як піша „Віленское Утро“, у Лідзе арыштавана 15 чалавек, якім закідаецца тварэньне Камуністычнай арганізацыі.

Арышты ў зьвязку з забойствам Гурына. „Głos Prawdy“ з дня 18. III. г. м. паведамляе, што ў зьвязку з забойствам правакатара Гурына, галоўнага сьведкі абвінавачаньня ў працэсе Грамады, апрача забойцы арыштавалі асобу жыдоўскай нацыянальнасьці, прозьвішча якога пакуль-што трымаецца ў тайне.

Яшчэ арыштавалі колькандацаць асоб і паміж імі жонку абвінавачанага б. пасла Тарашкевіча і Ю. Саковіча, студ. Віленскага Унівэрс. Арышты трываюць далей. П. В. Тарашкевіч была арыштавана ў суботу 17. III. г. м. а ў панядзелак 19. III. г. м. звольнена. Звольнены і Саковіч.

Выкрыцьцё камуністычнага Камітэту ў Лідзе. „Głos Prawdy“ паведамляе, што паліцыя выкрыла ў Лідзе павятовы Камітэт Кам. Пар. Заходняй Беларусі.

У лучнасьці з гэтым арыштавалі: Н. Юшчынскага, К. Матусэвіча, П. Пупко, К. Баярскага, С. Фрыдмана vel Пятроўскага, І. Гегоўскага, І. Любэцкага, Б. Троцкага, І Войткіма, І. Баярскага і А. Любэцкага.

Беларусізацыя Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі. З новага школьнага году, піша „Віленское Утро“, будзе праведзена беларусізацыя Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі ў Вільні. Рэктарам сэмінарыі будзе назначаны беларус. На колькі гэта вестка праўдзівая, трудна сказаць, пакуль ня будзе вестак з урадовых крыніц. Нам ведама, што ў справе беларусізацыі Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі рабіла ў свой час крокі Т-ва Беларускае Школы, як перад Міністэрствам Асьветы, так і перад вышэйшымі праваслаўнымі духоўнымі ўладамі.

Забастоўка шаўцоў. Гэта забастоўка цягнецца ў Вільні ўжо даўно. У зьвязку з гэтай забастоўкай 15 сакавіка скліканы быў сход усіх бастуючых шаўцоў у салі кіна „Piccadilli“. На сход зьявілася паліцыя і зачыніла сход.

„Дзен. Віл.“ піша, што забастоўка шаўцоў прыбірае шырокі характар. Кіраўнікі забастоўкі зьвярнуліся за помачай да клясавых прафэсіянальных саюзаў.

Да забастоўкі маюць далучыцца парыкмахеры і работнікі шкляных гутаў.

Выдаткі ў зьвязку з забастоўкай краўцоў. Краўцы таксама яшчэ бастуюць. Яны хочуць 30 прац. падвышкі, апіраючыся на тое, што пражыцьцё на столькі падаражэла; што дасюлешняй аплаты ім не хапала на пражыцьцё. Абурэньне работнікаў дайшло

ца таго, што яны пачалі выбіваць вокны выставаў у магазынах. Апрача таго пабілі некалькіх „штрайкбрэхараў“-краўцоў, што здрадзілі агульнай справе і пашлі на ўступкі, прыймаючы падвышку працадаўцаў у ліку 15 прац. заробку. У зьвязку з гэтым паліцыя арыштавала 3 чалавек.

Адначасна Гарадзкае Стараства зрабіла пэўныя загады з мэтай папярэджаньня падобных выпадкаў з боку бастуючых работнікаў.

Дэманстрацыя безработных у Вільні. 2 сакавіка каля 150 безработных, пераважна кабет, з прычыны таго, што магістрат ня выдаў дапамогаў, паходам падышлі да будынку ваяводзкага ўраду.

Ад імя безработных выслана была дэлегацыя, якую прыняў начальнік грамадзянскай апекі. Астаўшыхся-ж на вуліцы дэманстрантаў конная паліцыя разагнала. Прынамсі гэтак выясьнілі справу віленскія польскія газэты.

Канфлікт між дамаўласьнікамі і дворнікамі мае быць зьлiквідаваны. За гэтую справу ўзялася раз'емчая камісія, якая на паседжаньні 27 сакавіка думае гэты канфлікт зьліквідаваць.

Тая-ж раз'емчая камісія на паседжаньні 28 сакавіка думае вырашыць справу канфлікту між працадаўцамі і землиробскімі работнікамі. Якія карысьці работнікам прынясуць гэтыя паседжаньні раз'емчай камісіі — пабачым. Але цяжка спадзявацца палепшаньня ад гэтага палажэньня работніка.

З жыцьця польскіх газэт у Вільні. 17. III. г. г. быў скліканы надзвычайны агульны сход Саюзу Польскіх Журналістаў у Вільні ў сувязі з канфіскатамі польскіх віленскіх газэт: „Słowo“ і „Dziennik Wileński“. На сходзе ўхвалена гэткая пастанова:

Агульны сход Саюзу Польскіх Журналістаў у Вільні на сабраньні 17 сакавіка 1928 году, з прычыны беспадстаўных канфіскатаў 17. III. г. г. часопісяў „Dziennik Wileński“ і „Słowo“, папярэджаных аналягічнай канфіскатай „Kurjera Wileńskiego“ і „Expressu Wileńskiego“ 19 лютага 1928 году сьцьвярджае, што такое абходжаньне ўладаў робіць немагчымай нармальную прэсавую працу і пастанаўляе заклікаць у знак пратэсту, выдавецтва штодзенных часопісяў, да ўстрыманьня на 3 дні, пачынаючы 17 г. м. ад выдаваньня часопісяў.

Выдаўніцтва часопісяў „Słowo“, Kurjer Wileński“, Dziennik Wileński“ і „ABC“, прызнаючы слушнасьць гэтай ухвалы, пастанавілі перарваць выдаваньне сваіх часопісяў на 3 дні, такім чынам аж да серады. Дык вось, як засьпявалі польскія віленскія газэты дзеля адьэй канфіскаты, калі іх узяло за жывое. А што-б яны сказалі, каб пабылі ў нашай скуры хоць тыдзень?

Пературбацыі адміністрацыйна-урадавыя. Газэты прыносяць весткі, што маюць наступіць нейкія зьмены ў адміністрацыйна-ўрадавых сфэрах: віленскі ваявода п. Рачкевіч мае быць назначаным Пазнанскім ваяводай, а віленскім ваяводай мае быць мін. справ. Мэйштовіч (які зьліквідаваў Грамаду), на месца-ж Мэйштовіча будзе назначаны п. Цар, дасюлешні віцэ-міністар справядлівасьці.

Таксама мае пайсьці ў адстаўку мін. асьветы д-р Дабруцкі.

Які гэта будзе сюрпрыз для беларусаў, хай ацэніць кожны чытач сам.

Калі трэба падаваць заявы аб адсрочцы ваеннай службы. Усе навабранцы з 1907 г., якіх возьмуць у войска ў маі месяцы або ў чэрвені, і якія будуць старацца адсрочкі, маюць падаваць заявы аб адсрочцы такім чынам: тыя, што зьяўляюцца адзінай апорай сям'і, маюць падаць заяву ў Старостве ад 15 марца да дня ўступу ў войска. Студэнты і вучні маюць падаць заявы, пачынаючы 1-ым красавіком аж да дня ўступу ў войска.

Эміграцыя ў Аргэнтыну часова спынена. У зьвязку з сільным напльівам у Аргэнтыну эмігрантаў з Польшчы, урад Аргэнтыны зьвярнуўся да свайго прадстаўніка ў Польшчы спыніць выдачу візаў у Аргэнтыну на неазначаны час.

Забойства Гурына.

Віленскае „Утро“ падае падрабнасьці забойства Гурына. Яно піша: „16 сакавіка каля 11 гадзіны ўвечары ўласьнік півярні на Ягельлёнскай вуліцы гр. Тамашэвіч пачуў стрэл на вуліцы каля ўваходу да яго півярні. Праз мінуту ў памешканьне півярні ўбегла двое людзей. Адзін з іх упаў на падлогу, а другі, выхапіўшы рэвальвэр, тры разы стрэліў у лежачага на падлозе, пасьля чаго зараз-жа кінуўся ўцякаць. Усё гэтае зрабілася так хутка, што гр. Тамашэвіч здолеў толькі зрабіць трывогу сярод праходняў і паведаміў аб забойстве бліжэйшы камісарыят паліцыі.

На рагу Гданскай і Ягельлёнскай вуліц забойца спаткаў гр. Грыгайтыса, сэкратара адваката Міцкевіча. Грам. Грыгайтыс хацеў затрымаць уцякаючага, але апошні да яго стрэліў і пабег далей, у напрамку Віленскае вуліцы, дзе і быў злоўлены і разброены начным сторажам Т-ва „Ключы“.

У гэты ж самы час была паклікана да півярні гр. Тамашэвіча карэта хуткай помачы. Аднак, помач была ўжо непатрэбнай. Гурын быў знойдзены бяз знакаў жыцьця.

Пры вобыску ў кішані забітага быў знойдзены набіты рэвальвэр, якога забіты ня ўжыў, ці не хацеў ужыць.

Гурын у апошнія часы заўсёды жыў пад пагрозай сьмерці. Яшчэ ў мінулым годзе ў студні да Гурына стралялі якія-сь няведамыя людзі, ранячы яго ў нагу. Па прыбыцьці яго да Вільні, 14 траўня гэтага ж году на яго жыцьце была зроблена новае пакушэньне. У гэты дзень дзяжурны паліцыянт затрымаў няведамага акрываўленага чалавека. Двама стрэламі няведамы чалавек быў ранены ў плячо. Гэтым няведамым аказаўся Гурын. Ён, аднак, заявіў, што ніхто на яго жыцьце не пакушаўся, што ён сам сябе раніў прыпадкова.

Забітаму была 36 год“.

З Т-ва Бел. Школы.

Паведамленьне.

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы гэтым падае да агульнага ведама, што пасьведчаньне, выданае грам. Радзівону Антону з дня 6. XII. 26 г. № 1470, як дачаснаму кіраўніку Гуртка ў в. Вялікія Грынкі, Сьвіслацкае вол. Ваўкавыскага павету, уневажняецца.

2. Сяброўскі білет Т-ва Беларускае Школы, выданы на імя Касьцюка Язэпа за № 2112 з в. Вялікія-Грынкі ўневажняецца.

3. Сяброўскі білет Т-ва Бел. Школы, выданы на імя Паўла Вараб'я за № 4221 з в. Руда, Косаўскага пав., уневажняецца.

Віцэ-Старшыня (—)

Сэкрэтар (—)

Ад Мірскае Акр. Управы Т-ва Бел. Школы.

Гэтым даводзім да ведама, што ахвярнага збору на падпісным лістам на карысьць інтэрнатаў Беларускіх Гімназіяў паступіла да 29 лютага 1928 г. усяго на суму 210 зл. 33 гр. у гэткім парадку: 1) ад Турэцкага Гуртка атрымана 32 зл. 90 гр. і збожжа 8 п. 5 ф., 2) ад Стара-Сьвержанскага Гуртка атрымана 35 зл. 80 гр. і збожжа 3 п. 6 ф., 3) ад Драздоўскага Гуртка атрымана 43 зл., 4) ад Лядацкага Гуртка атрымана 15 зл. 30 гр., 5) ад Мала-Жухавіцкага Гуртка атрымана 16 зл. 79 гр., 6) ад Слабодзкага Гуртка атрымана 5 зл. 90 гр.

У зборах ахвяр, уладаю ставіліся перашкоды, (аб чым сьведчаць дадзеныя ад Лядацкага, Турэцкага і іншых Гурткоў заявы), матывуючы тым, што збор робіцца з палітычнаю мэтаю ў сувязі з выбарным часам. Дазвол на збор ахвяр атрыманы Акружною Управаю на ўсе Гурткі Т-ва і даверанныя асобы мелі на руках падпісныя лісты з подпісьсю і пячаткаю Акружнай Управы і копіяй дазволу ад Старостава. Акружная Управа ў хуткім часе паўторна будзе прасіць аб дазвол на збор ахвяр на тыя Гурткі, у якіх збор не адбыўся.

✕ **В. Пяшчанікі, Беласт. пав.** Пры гуртку Т-ва Бел. Школы ў в. Пяшчанікі з'арганізаваны драматычны кружок, які, дзякуючы сваім стараньням, наладзіў 15.II спэктакль-вечарыну, на якім былі згуляны п'есы: „Модны шляхцюк“ і жарт „Стараста“. Чысты даход пайшоў на адбудову Народнага Дому.

26.II таксама меліся паставіць камэдыю „Зьбянтэжаны Саўка“ і драму „У кавалёвай хаце“, але, нажаль, не атрымалі дазволу.

Карэспандэнцыі.

„Культура“ расьце.

(М-ка Ярэмічы, Стаўпецкага павету).

Дарэмна беларусы жаляцца, што польскі ўрад ня дбае аб разьвіцьці нашай культуры і дабрабыту. Наадварот, ён стараецца, каб як найбольш увясьці паміж беларусаў „культурных“ установаў, якія-б прынасілі „карысьць“ сялянству. Вось тут я і хачу сказаць аб гэтым пару слоў.

Да 1926 году мястэчка Ярэмічы вяло спакойнае жыцьцё, жыцьцё невялічкага мястэчка. Але вось пакрысе яно пачало падпадаць пад уплыў заходняе культуры.

Перш-на-перш тут заснавалася „ўстанова бясьпечнасьці“ (пастарунак). Жыцьцё ў м-ку яшчэ сталася спакайнейшым, бо, апрача чалавек 6-ці ці 7-мі паліцыянтаў, за захаваньнем спакою сочаць яшчэ некалькі „верных слуг“, з якіх асабліва вызначаецца сваей бясстыднай брахнёй на сялян Я. Янкоўскі. Яго досыць часта можна спаткаць на падваконьню, або за вуглом хат розных мясцовых жыхароў. Дзіўна, што яго да гэтага часу ніхто з сялян не абліў памыямі.

Але гэтага мала. „Культура“ ідзе далей. Нядаўна ў м-ку Ярэмічах адчынілі „Sprzedaż wódek i likierów“, якую сяляне не астаўляюць бяз увагі.

Дык вось, браткі мае, як бачыце, „культура“ на Крэсах расьце. Недалёкі.

Хоць блага, — але трэба жыць!

(Вёска Асова, Крывіцкае гм., Вялейскага пав.)

Нягледзячы на тое, што гэтая вёска, пачынаючы ад 1915 г. перацярпела шмат крыўд і бед у жыцьці гаспадарчым: па ёй у 1915 годзе перайшоў пажар ад вайны расейска-нямецкай, пасьля ў 1919-20 годзе, гэтая вёска перацярпела вайну польска-бальшавіцкую, і ў пачатку чэрвеня леташняга году прыйшлося панясьці вялікую страту — пажар.

І вось, ня гледзячы на ўсё гэтае марнае жыцьцё, народ ня сьпіць, пачынае варушыцца, пачынае брацца за культурную працу.

Гэтак 19 лютага с. г. у гэтай вёсцы ў доме селяніна Д. Грышкевіча, быў зладжаны сваімі сіламі спэктакль. Адыграны былі пьесы: „Чорт і Баба“ і „Шавец“.

Пасьля спэктаклю былі скокі і лятучая пошта. Наагул вечар адыграны быў добра. Даход, які на першы пачатак быў нязначны, дзеля таго, што на гэты спэктакль было шмат панесена расходу, але і той пойдзе на адчыненьне бібліатэкі.

На закончэньне спэктаклю выйшаў з дакладам аматар артыста Паўлюк Гурло, які паясьніў прысутным цяперашняе жыцьцё беларускага народу і на апошняе слова закончыў: „Не пагаснуць зоркі ў небе, пакуль неба будзе, і не загіне Край наш Родны, пакуль народ у ім будзе“.

Чэсьць і слава Асаўлянам, няхай будзе прыкладам і для другіх! Свой Госьць.

Вон з „Прасьветай“.

(в. Трапалова, в. Беніцкай, п. Маладэчанск.).

Нейкім парадкам у нашай воласьці зьявілася праклятай памяці б. канфідэнта А. Паўлюкевіча эксэпозэтурная крамка ягонай „Бел. Нац. Рады“ — „Прасьвета“. Перш-на-перш „вырасла“ ў в. Трэпалове і Доўгім Лагу, і толькі, а больш нідзе. Бо мы ўжо не сягодня ведаем, як Паўлючка, і другіх яму падобных (бо ёсьці такія-ж і Ярэмічы, Рагулі і Станкевічы). І я ўпоўнай веры, што гэтыя аддзелы дажываюць астатнія дні, і што асобы, якія ўвайшлі у прэзыдыум, а навет і вёскі, ачысьцяцца ад гэтай заразы. Хоць у аднэй ужо ўсе-ж такі і сарганізуюць, замест гэтай крамкі, Т-ва Бел. Школы, каторае запраўды стаіць на шляху культурна-асьветным! Бацька Пр.

З Радавае Беларусі.

Перабудова радыёстанцыі ў Менску.

Як паведамляе „Экспрэс Віленскі“, у Менску прыступлена да грунтоўнай перабудовы радыёстанцыі, на разбудову якой у сваім часе было адпушчана больш як 100 тысяч рублёў.

Юрыдычныя парады.

Пятручэню Ульяну. — Запытаньне — сяляне нашае вёскі пашлі церабіць уласнае пасьвішча, каторае за вайну зарасло алешнікам, даведаўшыся аб гэтым, абшарнік маёнтку „Міхаліна“ Міханоўскі прывёз паліцыю з Азярніцкага пастарунку і забараніў расьцяробку далейшую, а паліцыя сьпісала пратакол за самапраўства, адначасна трэбуючы дакумантаў на права ўласнасьці; у 1885 годзе Віленская Судовая Палата прызнала нам права на гэты сэрвітут, а Сэнат прысуд зацьвярдзіў, копіі пастановы Палаты і Сэнату ў часе вайны загінулі; абшарнік хоча адабраць у нас дзьве трэцьціх нашага пасьвішча, каторым мы карысталіся адны ад 1885 г.

Адказ — калі гэта сэрвітут, дык вы ня маеце права сеч лесу, калі ён ёсьць, церабіць кустоў і г. д., бо толькі „Ваша трава“, але і маеце права на адну трэцьцюю частку зямлі і то, калі яна не перавышае аднае чацьвёртае часткі ўсяе надзельнае зямлі.

У справе копіі судовае пастановы зьвярнецеся ў Віленскі Архіў Панствовы, (Wilno, ul. Uniwersytecka, Archiwum Państwowe).

Паштовая скрынка.

Жаўнікоўскаму. Ваша карэспандэнцыя з часам будзе зьмешчана з папраўкай. — **Янцы Шкуту.** Пісьма Вашага не зьмяшчаем па незалежных ад нас прычынах. **Мікалаю Шолю.** Вашы вершы не падыходзяць да друку ў нашай газэце, а лепш пішыце ў „Маланку“. — **Прыхаджаніну вёскі Філевічы.** Калі Ваш поп і дзяк — п'яніцы і раскушчаюць Вашы грошы, то Вы пажальцеся да Кансісторыі. — **Гарадзенцу.** Вы пастарайцеся самі-ж зрабіць уплыў на сваіх калегаў, і вытлумачыць ім, што лепей пачытаць газэту чым у карты гуляць. Пішыце аб цяперашнім жыцьці.

Усячына.

Атручваньне вады.

У сажаўках і вазёрах польска-нямецкага пагранічча заўважана ад пэўнага часу выміраньне рыбаў. Інспэктар рыбалоўства ў Быдгошчы адправіўся ў тыя ваколіцы дзеля збаданьня прычын. Як прыпушчаюць, прычына — атручваньне вады.

Нацыянальны склад СССР.

У канцы 1926 году была зроблена ў СССР перапісь ўсяго насельніцтва. Дадзеныя гэтае перапісі нядаўна засталі абвешчаны. Яны паказваюць, што на ўсім абшары СССР ёсьць 610.000 заселеных мейсц, як мястовых, так і сялянскіх. Усяго ж жыхарства налічваецца 147 мільёнаў, якія па нацыянальнасьцям раскладваюцца так:

	У тысячах	%
Расейцы	77,760,1	52,9
Украінцы	31,194 8	21,2
Беларусы	4,738,9	8,2
Казакі	3,959,9	2,7
Узьбекі	3,904 5	2.6
Татары	3,015,2	2,0
Жыды	2 609,9	1,8
Грузіны	1,821,6	1,2
Туркі	1,706,6	1,2
Армяны	1,567,5	1,9
Мардва	1,340,4	0,9
Немцы	1,238,5	0,8
Чувашы	1.117,4	0,7
Таджыкі	978,2	0,7
Палякі	782,3	0,5
Кіргізы	768,7	0,5
Туркмэны	786,1	0,5
Башкіры	713,7	0,4
Вацякі	564,2	0,3
Мары	428,2	0,3
Чачэнцы	392.6	0,3
Малдованы	278 9	0,2
Асеціны	272,2	0,2
Карэлы	248 1	0 2
Мішары	348,6	0,2
Вураты	237,5	0,2
Комі	221,3	0,2
Чаркесы	219,6	0,2
Якуты	214,8	0,2
Грэкі	213.8	0,2

Рэха выбараў у Сойм і Сэнат.

Карыстаючыся газэтнымі дадзенымі знаходзім, як „Dz. Wil.“ № 62 падае на шпальтах свае газэты аб выбарах да Сойму ў віленскай акрузе дзе П. П. С., ўносіць пратэст аб уняважненьні выбараў. Пратэст гэты бачым з наступнага:

„Robotnik“ з дня 15. III. паведамляе, што Акружны Выбарны Камітэт ППС у Вільні зложыў пратэст у Найвышэйшы Суд у справе выбараў. Паводле ўрадовых даных — ліста № 2 атрымала 16.697 гал. Затым укінута 450 нумаркоў на якіх была лічба 2 з кропкай. Па ўзнаньні іх з паваротам за важныя сума галасоў павінна раўняцца 17.147. Ажно, як відаць, фактычна выпала на лісту ППС № 2 16.735 галасоў. Некалькіразовы пратэст у Акружнай Выбарнай Камісіі ня прынёс ніякіх рэзультатаў.

Далей „Robotnik“ падае, што да Камісіі ў Вялікіх Мечніках прыбылі паўнамоцнікі лісты і засталі ўрну запячатанай у 8 гадз. 30 мін. Па энэргічных стараньнях з боку паўнамоцніка з лісты № 2, Камісія расьпячатала ўрну і знайдзена там большасьць галасоў на № 1. На жаданьне паўнамоцніка з лісты № 2 факт гэты запратаколены“.

Як адбываліся выбары.

Вось, што піша ў № 68 „Robotnik“ аб выбарах:

„Надходзяць падрабязныя весткі, абапёртыя на фактах і на дакумэнтах аб ходзе выбарнай кампаніі ў вокругах палескага ваяводзтва. Чытаем іх з пачуцьцём палючага стыду за Польшчу, з абурэньнем, у якім няма ані крыху „нязбыўшыхся надзеяў партыйнікаў“.

„Гэта ня былі выбары. Гэта было адно непрарыўнае надужыцьце, гэта было штодзеннае, выразнае ламаньне права і — разам хаўтуры польскага права ў сьведамасьці тамашніх працоўных масаў.

„Паны паслы „jedynki“ з 60 і 59 выбарных вокругаў! Ня можам Вас прызнаць за праўдзівых паслоў. Не дасталі Вы мандатаў у лёяльным, чэсным змаганьні ідэі, праграмаў, думкі. Дакуманты і факты, аб якіх гаворым, будуць мець сваё належнае асьвятленьне і з соймавай трыбуны і ў Судзе Найвышэйшым. Раскрыюць усё. І падкуп, і рэпрэсіі, і фальшаваньне. Даведаецца аб іх Польшча. Ня можна будзе канфіскаваць таго, што скажам на яўным паседжаньні Сойму Рэчыпаспалітай. Ведаем, што ў апініі публічнай, што ў апініі работніцкай паўстане стыхійная праява гневу. Пад гэтым гневам, пане Крагельскі захістаецца Ваша „дыктатура“. „Перасаліў“ пан. І для вас ужо няма звароту, з вамі няма ўжо згоды. Забыліся вы, што незабавам надойдзе час, калі надужыцьце ўлады дзеля селяніна-паляшука будзе карана таксама, як надужыцьцё ўлады дзеля князя Радзівіла.

„А вам, панове паслы, з „jedynki“, якія прыймеце мандаты, так атрыманыя, скажам толькі адно слова: стыдна“.

Аб уневажненьні выбараў.

У наморскіх кругах прыпушчаюць, што выбары ў Кашубах будуць уняважнены, дзякуючы пратэсту жыхароў Гдыні, гдзе, з поваду выбарных заганаў, не галасавала каля 2000 польскіх выбаршчыкаў. Гэта дало магчымасьць прайсьці немцу Татулінскаму па кашубах большасьцяй блізу 300 галасоў.

Рэдактар-Выдавец: Пілiп Назарук.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.